# *М. І. Канюшкевіч:*
# «Зычу плёну ў працы і вясны ў душы»

**Марыя Іосіфаўна Канюшкевіч — вельмі паважаны ў нашым універсітэце чалавек. Заўсёды элегантная, прыветлівая, з добразычлівай усмешкай на вуснах — такой яна бачыцца нам пры сустрэчы. А яшчэ яна надзвычай эрудзіраваная жанчына, вопытны педагог і кіраўнік. Яно і не дзіўна — М. І. Канюшкевіч — доктар філалагічных навук, прафесар, дэкан філалагічнага факультэта.**

**Марыя Іосіфаўна ахвотна згадзілася падзяліцца сваімі думкамі ў святочным нумары газеты. Размова ідзе аб жанчыне, сям'і, Радзіме.**

**— Марыя Іосіфаўна, кожны год мы, мужчыны, з нейкім трапяткім хваляваннем чакаем гэтае свята, рыхтуем падарункі. Якое пачуццё адольвае Вас, жанчыну, у самы жаночы дзень?**

— Я чакаю Цуда. А яшчэ ў гэты дзень прыходзіць вясна. Яна пахне, звініць, пяе, усміхаецца... Яшчэ віхурыць мяцеліца, а мы, жанчыны, бачым, як на галінцы бэзу з пупышкі выглядае кволая лістота. Вам, мужчынам, гэтага ніколі не ўбачыць.

**— Год-два назад ішлі сур'ёзныя размовы аб святах і нерабочых днях. Адзін з дэпутатаў прапаноўваў нават не рабіць дзень 8 Сакавіка непрацоўным. Гэта, разумеецца, анахранізм, але тым не менш, якім з'яўляецца ён для Вас? Рабочым ці нерабочым, бо жанчыне хапае працы дома ў любы дзень? Як Вы яго сустракаеце? Хто рыхтуе святочны стол? Самі? Мужчыны?**

— Я ў гэты дзень адпачываю. Рыхтую святочны стол, гатую асабліва смачныя стравы, бо калі ж, як не ў гэты дзень, можна паказаць, што я ўсё-такі жонка, гаспадыня? У іншыя ж дні я не магу многа ўвагі аддаць сям'і, і талоны атаварвае муж. Ён ходзіць «на маманта», а я гатую.

**— 8 Сакавіка ў народзе называюць яшчэ святам вясны. І сапраўды, абуджаецца прырода, абуджаюцца пачуцці. Што Вы хацелі б пажадаць маладым дзяўчатам, сваім выхаванцам у гэты дзень?**

— Каб кожная ў гэты дзень атрымала ад каханага падарунак: кветкі, усмешку, чаканае слова, верш, пацалунак, добры ўчынак...

**— Марыя Іосіфаўна, Вы ўзначальваеце вялікі калектыў. У асноўным ён жаночы. Ці цяжка працаваць, ці знаходзіце са сваімі калегамі ўзаемаразуменне? Як ставіцца да Вашых заўваг, парад мужчынская палова? Што хацелі б параіць мужчынам?**

— Каб знайсці паразуменне з жаночым калектывам, прыходзіцца не аднойчы забываць, што сама з'яўляешся жанчынай. Парадокс, але ж так. Калі з аднаго боку ўсплеск эмоцый, то другі ж бок ужо не мае права на эмоцыі!

З мужчынамі лягчэй. Калі гэта начальнік, то (не перастаю здзіўляцца гэтаму заўсёды), усмешкай і добрым выглядам можна хутчэй даказаць, чым самым падрыхтаваным і лагічным абгрунтаваннем. Калі гэта падначаленыя, то з сумам адчуваю, што мяне прымаюць толькі як шэфа, то ж бо шэфіню. Адпаведна прымаюцца і заўвагі.



Мужчыны-калегі (а гэта ж усе мужчыны нашага універсітэта, у тым ліку і студэнты) перш-наперш заўважаюць мяне як жанчыну. Гэта відаць па мілых дробязях: як першай прапускаюць у дзверы, як устаюць пры сустрэчы, падаюць паліто, дапамагаюць апрануцца. У нашым універсітэце вельмі многа прыкладаў рыцарскіх адносін да жанчыны.

**— Раскажыце крышку пра сябе. Адкуль родам, як вучыліся, працавалі. Аб сваёй сям'і. Думаю, кожнаму маладому чалавеку, які ўступае ў жыццё, цікава ведаць падрабязнасці пра свайго настаўніка.**

— Я з сялянскай сям'і. Нарадзілася ў вёсцы Погіры, што на Дзятлаўшчыне. Мама мая была непісьменная парабчанка-сірата, але натура яе была таленавітая, творчая. Вельмі ж яна марыла, каб дачка адукаваная была. Я бачыла яе жаданне, але і самой хацелася вучыцца. Можа, гэта крыху інтымнае, але хачу некалькі эпізодаў з свайго жыцця расказаць.

Першы. Каб пракарміць зімой карову, улетку прыйшлося мне і маці на сваіх плячах мяхі з зеллем насіць. Яно цяжкае, сырое. Мне, школьніцы, пачытаць, пагуляць хочацца. А мама спакушае: будзе корм кароўцы, табе сукенку купім, партфель (да 7 класа ў мяне торбачка была для кніг)... І вось, ужо восеннню, прыходжу дамоў са школы, а ў мамы твар, як нябожчыка пахавала. А гэта прыйшлі калгасныя актывісты і ўвесь корм, гэтае сухое зелле, дзіцячымі рукамі за ўсё лета вырванае і знесенае, вывезлі. У мяне душа быццам спяклася.

Другі. Я ўжо студэнтка-першакурсніца. Перабіваюся з хлеба на ваду. Дамоў паедзеш, нішчымніца раем здаецца. Мама для дачкі блінцы на бульбе з мукой гатуе. А ў хаце ні кавалка сала, ні лыжкі алею. Мажа патэльню цыбуляй і плача, што сваю студэнтку лепш пачаставаць не можа.

Трэці. Амаль адразу за першым. Я ў сваім пісьме, неяк вельмі марознай зімой, пажалілася, што рукі мерзнуць (пра пальчаткі і рукавіцы тады ў нас і не дбалі: не да іх было). Мама абскубла зарэзаную курыцу ды ў гэты мароз на базар у Дзятлава: дачцэ на рукавіцы. Прастуда, пасцель... Да апошняга дня не дазваляла братам мяне клікаць: у мяне сесія была. Заспела я маму жывой за дзень да смерці.

Я ніколі сабе не дарую за тое пісьмо. Суцяшала мяне толькі адно: можа я сваёй вучобай і сваёй прафесіяй хоць крышачку кампенсавала яе непатоленую прагу да адукацыі. Як яна ўглядалася ў гэтыя незразумелыя чорныя літары на белай паперы! Што за імі? Які свет? Якія людзі? Ці такія, як мы? Прасіла пачытаць уголас... Божа, чаму дзеці такія сляпыя і глухія?

Цяпер у мяне свае дзеці. Сын без вышэйшай адукацыі, па здольнасцях быў бы добры філолаг, спрабуе шукаць сябе. Дачка жыве ў Краснаярску, дзіцячы ўрач. Маю двух унукаў. Дзеці ўважлівыя і клапатлівыя, яны мне давяраюць і разумеюць мяне.

Я шчаслівая жонка. Муж, дзіцячы хірург, дапамагае мне ў хатніх клопатах, разумее мае праблемы, ведае ўсіх маіх сяброў, многіх маіх студэнтаў.

Нядаўна, вяртаючыся з курсаў павышэння кваліфікацыі, прывёз мне з Мінска букет кветак. Аўтобус прыйшоў позна вечарам, мужу хацелася ўвайсці ў кватэру з кветкамі. Згадзіцеся, пражыўшы трыццаць гадоў разам, памятаць пра кветкі... Ого!

**— А цяпер пажаданні. Чаго жадаеце Вы нашай суверэннай краіне, нашым людзям, якія так стаміліся ад розных недахопаў і г. д. Якім Вы хацелі б бачыць наш універсітэт?**

— Я дазволіла сабе крыху ўспамінаў, каб цяпер сказаць галоўнае. Нам трэба вучыцца ў тых, хто гараваў больш за нас, але не «озлобился», не наракае на ўвесь белы свет за сваё пакалечанае жыццё. Вучыцца ў Д. Ліхачова, Б. Чычыбабіна, С. Грахоўскага... Гэтых людзей я слухала па тэлебачанні. І любавалася, і захаплялася імі. І зноў нагадвалася мне мама, якая не вельмі любіла калгасы, але цаніла Савецкую ўладу за «бясплатную вучобу і бясплатнае лячэнне». Я змагла скончыць інстытут толькі дзякуючы Ленінскай стыпендыі.

Я вельмі баюся, каб мае ўнукі і іх пакаленне не паўтарылі лёс маёй мамы-парабчанкі.

Ну, а калі вярнуцца да святочнай тэмы, то звярніце ўвагу на тое, што бальшасць краін мае жаночае імя: Італія, Канада, Украіна, Польшча, Беларусь... І зусім мала мужчынскіх: Іран, В'етнам, Люксембург... Беларусь — самая жаночая з краін. Яна ўмее верыць, цярпець і працаваць. І заставацца прыгожай. Зусім, як жанчына!

А наш універсітэт няхай будзе лепшы з яе дзяцей. Паеўрапейску элегантны, з польскім шармам, з рускай класікай, па-амерыканску раскаваны і багаты, з мілай беларускай шчырасцю і працавітасцю.

**— Што Вы хацелі б сказаць тым, у каго вучыліся, з каго бралі прыклад. Я думаю, што такія жанчыны ёсць у нас ва універсітэце?**

— Ёсць, і многа. Я заўсёды адчуваю сябе перад імі студэнткай і памятаю іх клопат, увагу, веды, вопыт. Ды і цяпер вучуся ў Елізаветы Іосіфаўны Лаўрынайціс, Святланы Піліпаўны Мусіенка, Лідзіі Уладзіміраўны Кірылюк, Ганны Серафімаўны Сідарчук, Антаніны Васільеўны Нядзелька, Таццяны Аляксандраўны Альсмік, Ніны Сяргееўны Конанавай.

**Зычу Вам усім добрага здароўя, шчасця, плёну ў працы і вясны ў душы!**

**Пытанні задаваў**
**Уладзімір АМЕЛЬКА.**

## Слова пра настаўніка

## *Няўрымслівая*

15 гадоў працуе ў нашым універсітэце на кафедры псіхалогіі Святлана Вітальеўна Кандрацьева. Яна доктар псіхалагічных навук, прафесар, узначальвае зараз гэтую кафедру.

Святлана Вітальеўна — прадстаўнік таго пакалення, якое зведала на сабе ўсе жахі вайны, пасляваеннай разрухі. Нарадзілася яна ў сям'і настаўнікаў, бацька быў рэпрэсіраваны ў сталінскія гады, затым рэабілітаваны. Зусім юнай, у 18 гадоў, добраахвотніцай пайшла Святлана Вітальеўна на фронт. У сямейным альбоме Святланы Вітальеўны нямала фотаздымкаў той суровай ваеннай пары.

Пасля вайны яна паступае ў Ленінградскі універсітэт, і ўсё яе далейшае жыццё звязана з навукай. У Драгобыцкім педінстытуце на Украіне, дзе да гэтага працавала, стварыла кафедру псіхалогіі.

Прыехаўшы на працу ў Гродна, Святлана Вітальеўна шмат намаганняў прыкладвае па арганізацыі работы кафедры псіхалогіі, адкрыцці аспірантуры. Не без яе ўдзелу падрыхтавана 9 кандыдатаў навук. Цяжкасцей было нямала, бо аспіранты не мелі спецыяльнай базавай адукацыі. Змаглі адкрыць пры універсітэце спецыяльнасць практычных псіхолагаў на біялагічным факультэце, курсы школьных псіхолагаў. Дзякуючы намаганням С. В. Кандрацьевай, закладваліся асновы псіхалагічнай службы ў вобласці.

С. В. Кандрацьевай распрацавана канцэпцыя сацыяльна-псіхалагічнай творчасці настаўніка, якая рэалізуецца зараз у канкрэтных даследаваннях супрацоўнікаў кафедры і ўкараняецца ў практыку. Яна з'яўляецца членам двух спецыялізаваных рад.

Святлана Вітальеўна знаходзіцца ў росквіце творчых сіл. Шмат піша, нядаўна выдала кнігу па практычнай псіхалогіі, падрыхтавала да друку вучэбны дапаможнік. Марыць адкрыць ва універсітэце псіхалагічны факультэт і навукова-псіхалагічную лабараторыю.

А яшчэ яна хораша спявае. Кожнаму, хто яе чуў, запамінаецца яе цудоўны, мяккі голас.

**П. КАВАЛЕЎСКІ.**

## Для навучальнага працэсу

87 мільёнаў рублёў плануецца выдзеліць сёлета на набыццё новай тэхнікі і абсталявання. Аддзел міжнародных сувязяў, маркетынгу і права сумесна з саветам па новай тэхніцы сабралі заяўкі ад усіх факультэтаў, склалі перспектыўны план матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння. Толькі ў бягучым годзе будзе набыта і ўкаранёна больш як 50 найменняў рознага віду машын і абсталявання. Набыццём новай тэхнікі даручана займацца вопытнаму забеспячэнцу А. С. Плюсніну.

Многае ўжо набыта і зараз устанаўліваецца ў аўдыторыях. У першую чаргу гэта датычыцца ўкаранення ў навучальны працэс інтэнсіўных тэхналогій. Так, у 323 аўдыторыі галоўнага корпусу ствараецца спецыяльны клас для відэатрэнінгу і дзелавых сітуацыйных гульняў, вывучэння замежных моў. Закуплены відэадвойка «Самсунг», музычны цэнтр, набыта адпаведная мэбля. Зараз вядуцца перагаворы аб пастаўцы нам праграм для відэакамп'ютэрных класаў.

Нядаўна універсітэт набыў новую відэаапаратуру, што дазволіць здымаць фільмы, выкарыстоўваць іх у навучальным працэсе.

**В. МЯТЛІЦКІ.**

*Проба пяра*

# Яркі дзень майго дзяцінства

**На думку некаторых вучоных, аб педагагічных здольнасцях студэнта — будучага настаўніка можна меркаваць, у прыватнасці, па ступені яркасці, жывасці яго ўспамінаў дзяцінства. На адным з лабараторных заняткаў па педагогіцы студэнты экспромтам пісалі мікрасачыненне на гэтую тэму.**

**Сачыненне Ж. Янкоўскай выклікала жывы водгук аўдыторыі яркасцю адлюстраваных у ім перажыванняў. Дарэчы, адказы Жаны на экзамене па педагогіцы заслужана ацэнены на «выдатна».**

**Прапануем увазе чытачоў гэтую працу.**

**Дацэнт І. ПРАКОП 'ЕЎ.**

Гэта было даўно, калі я вучылася ў першым ці другім класе. Наша школа стаяла, як мне здавалася, вельмі далёка ад вёскі. Напэўна я тады была вельмі маленькай, прынамсі, як потым высветлілася, так лічылі мае бацькі. Я ж сябе тады не лічыла ні маленькай, ні вялікай, а проста чалавекам, ці, хутчэй за ўсё — чалавечкам. Але, галоўнае,— сапраўдным, сапраўдным чалавечкам. І вось, як сапраўднаму чалавечку, захацелася даведацца, што такое свабода. Гэта я цяпер так разумею, а тады захацела паспрабаваць гэтай свабоды і зрабіць тое, што мне захацелася. І адразу пасля ўрокаў я пайшла не дахаты, а адправілася з іншымі такімі ж сапраўднымі чалавечкамі ў суседнюю вёску, якая ад школы была таксама вельмі далёка, а ад майго дома гэта ўвогуле было за трыдзевяць зямель. Для мяне гэта было сапраўднае падарожжа.

Я пабывала ў гасцях у траіх ці чацвярых сваіх сябровак. І ў кожнай з іх прыветлівыя мамы запрашалі мяне, частавалі ўсялякімі дэлікатэсамі. Словам, было хораша і весела. Тое, што трэба ісці дахаты, бо пачало цямнець, я, дарэчы, не сама зразумела. Аб гэтым мне напомніла адна з мамаў. Тады я палічыла, што нават гасцінныя мамы вельмі груба і нетактоўна парушалі свабоду сапраўднага чалавечка. Але ўсё ж дахаты ісці прыйшлося. Не без шкадавання, канечне, я адправілася ў дарогу.

Якое ж было маё здзіўленне, калі на паўшляху мяне сустрэла маці. І не проста сустрэла! У руках у яе быў пагражальны бярозавы бізун. Можа, ён і не быў такім пагражальным, як мне тады здалося, ды, можа, і не бізун гэта быў зусім, а пруток, але тады ён мне здаўся быццам бы палкай. Безумоўна, слёз было дастаткова. Я ледзьве паспявала за мамай. А калі далей па дарозе мы сустрэлі яшчэ і бацьку, дык слёзы паліліся як з вядра.

Дома мне прыйшлося прастаяць увесь вечар у кутку. Я, безумоўна, лічыла такое пакаранне (і лічу цяпер) вялікай несправядлівасцю, бо гэта было замахам на маю свабоду.

**Жана ЯНКОЎСКАЯ, студэнтка 3 курса філалагічнага факультэта.**



Нізкі паклон і шчырыя святочныя віншаванні мы шлём сёння нашым ветэранам. На іх жыццёвым шляху былі і цяжкія выпрабаванні, як у ўдзельніцы Вялікай Айчыннай вайны Галіны Дзмітрыеўны Заўгародняй, і радасць працы, сямейнага шчасця. Многія з ветэранаў працягваюць працаваць у нашым калектыве. Свой вопыт, веды яны перадаюць сваім дзецям, унукам, больш маладым работніцам.

На здымку (злева направа): прыбіральшчыца Надзея Аляксандраўна Русілка, гардэробшчыцы Галіна Дзмітрыеўна Заўгародняя і Яўгенія Лукінічна Баліцкая.

**Фота У. САРОКІНА.**



Паслугамі бібліятэкі карыстаюцца ўсе студэнты і выкладчыкі. Работнікі яе імкнуцца хутка і якасна абслужыць чытачоў, дапамагчы знайсці патрэбную кнігу. А працуюць тут толькі жанчыны, менавіта яны дораць нам радасць пазнання, цікавую сустрэчу з кнігай.

На здымку (злева направа): работнікі бібліятэкі Галіна Фёдараўна Ляскова, Тамара Цімафееўна Мацвеенка, Надзея Рыгораўна Халецкая, Людміла Фёдараўна Ганчарова.

**Фота У. САРОКІНА.**

*Для вас, жанчыны*

# *Захоўвайце сваю прыгажосць*

Прыгожы выгляд жанчыны вызначаецца многімі фактарамі: узростам, спадчыннасцю, харчаваннем, кліматам, прафесіяй. Але бясспрэчна адно — кожная жанчына прыгожая па-свойму. І гэтую прыгажосць неабходна захоўваць. За прыгажосць трэба пастаянна змагацца!

Самы здаровы сон да наступлення поўначы.

Кладзіцеся спаць заўсёды ў адзін і той жа час, спіце ў добра праветрываемым памяшканні — пры адчыненай фортцы.

Перад сном старайцеся менш есці і зусім выключыце з вячэры цяжказасваяльную ежу, а таксама каву, алкаголь.

Перш чым легчы ў пасцель, пастарайцеся стварыць у сябе добры настрой — прыміце цёплы душ, паслухайце ціхую музыку і зусім забудзьце пра свае клопаты, крыўды, абурэнне.

Спіце ў цёмным пакоі, у лёгкай і свабоднай начной кашулі, на нізкай падушцы — каб пазбегнуць утварэння маршчын на шыі і двайнога падбародка.

Ваша становішча ў ложку павінна быць галавой на поўнач, нагамі — на поўдзень.

Для захавання прыгажосці і маладосці вельмі важна правільна ўставаць пасля абуджэння. Зусім недапушчальна, ледзь расплюшчыўшы вочы, ускокваць з ложка. Паляжыце выцягнуўшыся з рукамі, закінутымі за галаву, зрабіце некалькі практыкаванняў.

Закончыўшы дыхальныя практыкаванні, займіцеся гімнастыкай. Ваш звычайны ранішні комплекс, потым цёплы, а затым халодны душ. Разатрыцеся энергічна махровым ручніком.

Для добрага колеру твару выпіце на галодны страўнік такую гарбату: 1 ст. лыжку рамонку заліць шклянкай кіпячонай вады, пакінуць накрытай 10 хвілін, працадзіць, падсаладзіць 1 чайнай лыжкай мёду.

А на снеданне — амерыканкую салату прагажосці:

5 лыжак аўсяных шматкоў, нанач залітых 5 лыжкамі кіпячонай халоднай вады, змяшаць з 1 лыжкай мёду і 5 здробленымі зярнятамі ляснога арэха.

Ешце салату павольна , добра перажоўваючы. Можа, гэтая салата здасца нясмачнай, але да яе можна прывыкнуць, калі хочаш быць прыгожай.

Вынік вы ўбачыце ў люстэрку праз месяц. Маладосць і прыгажосць дарэмна не даюцца. Не дазваляйце сабе старэць!

# Ці будзе платным навучанне?

*Актуальнае інтэрв 'ю*

**У рэдакцыю газеты і аддзел міжнародных сувязяў, маркетынгу і права звяртаюцца людзі з просьбай растлумачыць, ці праўда, што ва універсітэце будзе ўводзіцца толькі платнае навучанне.**

**АДКАЗВАЕ ПРАРЭКТАР ПА МІЖНАРОДНЫХ СУВЯЗЯХ І КАМЕРЦЫЙНАЙ РАБОЦЕ В. П. ТАРАНЦЕЙ.**

— Хачу адразу супакоіць: адукацыя ў нас будзе бясплатнай.

Тым не менш, трэба размяжоўваць два паняцці: платная адукацыя і платныя паслугі ў адукацыі.

Платная адукацыя існуе толькі ў некалькіх краінах, да іх у першую чаргу трэба аднесці Японію. Усе астатнія краіны спалучаюць платную адукацыю і платныя паслугі ў адукацыі. Усе ведаюць, што бясплатнасць адукацыі і бясплатнасць медыцынскіх паслуг засталіся, бадай што, адзінымі дасягненнямі таго ладу, які быў у нас, і было б несправядлівым ад іх адмаўляцца.

Праўда, ва ўрад былі ўнесены прапановы зрабіць часткова платным навучанне ў 10—11 класах і магістарскую ступень навучання. Гэтыя прапановы, я думаю, не будуць зацверджаны Вярхоўным Саветам.

Хачу сказаць, што рэктарат і супрацоўнікі універсітэта супраць платнай адукацыі. Урэшце-рэшт, у межах дзяржзаказу яна павінна быць бясплатнай.

Але колькасць асоб, якія хацелі б вучыцца вострадэфіцытным спецыяльнасцям, значна пераўзыходзіць магчымасці дзяржзаказу. Таму большасць ВНУ рэспублікі даюць магчымасць любому грамадзяніну атрымаць першую ці другую вышэйшую адкацыю за плату звыш дзяржаўнага заказу. Бывае так, што чалавек плаціць сам, а бывае, што і арганізацыя, якая яго накіроўвае. Не зрабіць гэтага — значыць адмовіць чалавеку ў адным з яго законных правоў, вярнуцца да таталітарнай, раз і назаўсёды ўстаноўленай адукацыйнай палітыкі.

У прыватнасці, такая патрэба тлумачыцца яшчэ і тым, што ў ЗША цяпер налічваецца асоб з вышэйшай адукацыяй на 5 млн. больш, чым у былым Саюзе. А ў 60-я гады гэтая розніца складала толькі 300 тысяч чалавек.

Зараз у нашым універсітэце займаецца на дагаворнай падставе на ўсіх формах навучання 763 студэнты з 6900. У наступным навучальным годзе гэтая лічба павялічыцца. Вядома, што мы будзем развіваць і іншыя платныя паслугі (ажыццяўляць перавод студэнтаў з іншых ВНУ, аднаўляць сваіх студэнтаў, даваць платныя кансультацыі, развіваць адукацыйныя цэнтры і г. д.).

Такая пастаноўка навучальнага працэсу — заканамерная практыка ўсіх краін. Напрыклад, у Англіі універсітэт атрымлівае толькі 47—50 працэнтаў бюджэтных асігнаванняў, а астатняе зарабляе сам. У Швейцарыі таленавітых студэнтаў бяруць на першы курс на бясплатнай падставе. Але затым, калі ён не пацвердзіць свайго таленту, яго пераводзяць на платную адукацыю ці адлічваюць.

Як у нас, так і ў іншых краінах ёсць сацыяльныя ільготы. Таму на сённяшні дзень няма ніякіх падстаў для сумнення, што ў нашай дзяржаве будзе платная вучоба. Як і раней, вучоба ў вышэйшай і сярэдняй школе будзе бясплатнай.

# *Абараніў дысертацыю*

Віншаванні ад сваіх калег, студэнтаў, сяброў прымае ў гэтыя дні выкладчык кафедры гісторыі Беларусі Віктар Ве- [illegible] хова абараніў дысертацыю на атрыманне вучонай ступені кандыдата гістарычных навук.

Віншуем!

# Пасяджэнне Тэрміналагічнага цэнтру

19 лютага адбылося першае пасяджэнне створанага ў нашым універсітэце (паводле загаду рэктара 11 лютага 1993 г. № 60) Тэрміналагічнага цэнтру.

Пасяджэнне пачаў прарэктар па навучальнай працы дацэнт Я. Роўба. Ён казаў пра вострую неабходнасць для стварэння гэтага падраздзялення ў сувязі з пераходам усяго навучальна-выхаваўчага працэсу ва універсітэце, як і ва ўсіх ВНУ Беларусі, на беларускую мову. Ён абвясціў загад рэктара пра склад Тэрміналагічнага цэнтру (ТЦ). У яго ўвайшлі праф. П. Сцяцко — старшыня, дацэнт Д. Карацінская — намеснік старшыні, лабарант кафедры мовазнаўства В. Хадкевіч — вучоны сакратар, дац. Т. Капылова, дац. У. Карчэўскі, дац. Г. Сідарчук, дац. І. Басюк, дац. А. Каладзінскі, праф. Н. Паўловіч, праф. В. Чарапіца, дац. А. Іваноў. У загадзе запісана: «Тэрміналагічнаму цэнтру каардынаваць і разглядаць матэрыялы розных аддзелаў і службаў, шматтыражнай універсітэцкай газеты, навучальна-метадычных распрацовак».

Затым слова атрымаў старшыня Тэрміналагічнага цэнтру доктар філалагічных навук П. Сцяцко. Ён пазнаёміў прысутных — сяброў ТЦ — з палажэннем пра Тэрміналагічны цэнтр Гродзенскага універсітэту імя Янкі Купалы. Як адзначана ў «Палажэнні», «ТЦ каардынуе ўсю навукова-метадычную працу, што праводзіцца ў кірунку распрацоўкі і ўдакладнення беларускай нацыянальнай тэрміналогіі, абмяркоўвае матэрыялы, пададзеныя навучальна-выдавецкім аддзелам, і прымае рашэнне пра мэтазгоднасць іх выдання на беларускай мове. Па ўзгадненні з рэктаратам (рэктарам) Цэнтр стварае факультэцкія камісіі беларуска-моўнага тэрміналагічнага кірунку, якім даручае канкрэтную працу ў пэўнай галіне тэрміналогіі».

Прафесар П. Сцяцко спыніўся на асобных пытаннях працы ТЦ, а таксама казаў пра неабходнасць унармавання беларускай тэрміналогіі, засведчанай сучаснымі беларускімі слоўнікамі, бо яна ў многім знявечана, паспытаўшы ўплыў ідэі зліцця моваў. Невыпадкова, што ў 1993 годзе будзе перавыдадзены наш найноўшы «Русско-белорусский словарь» 1991 года.

Прынята рашэнне праводзіць пасяджэнні ТЦ штомесяц у трэці чацвер у 17.00 гадзін.

**Віялета ХАДКЕВІЧ,**
**вучоны сакратар Тэрміналагічнага цэнтру.**

Грымасы жыцця

## Згодна са звычаямі

Звычаі суправаджаюць чалавека ўсё жыццё. Іх нельга ні прыдумаць па заказу, ні жорстка адмяніць. Яны — з´ява гістарычная, якая характарызуе жыццё таго ці іншага сацыяльнага слою. Устойлівыя звычаі ёсць у любога народа. Многія, як правіла, звязаны са стварэннем сям´і. Вось некаторыя з іх.

Дзіўны шлюбны звычай захоўваецца ў аддаленых раёнах Паўднёвага Йемена. Дзяўчына, перш чым стаць жонкай свайго суджанага, праводзіць ноч з шэйхам роду ці племя або з якім іншым паважаным тут мужчынам, якія пасля гэтага «сведчаць» у карысць яе чысціні, непарочнасці і іншых жаночых скарбаў. Магчыма, гэта своеасаблівае адлюстраванне «права першай ночы», якое існавала каля ста гадоў назад у шэрагу народаў.

У Іраку распаўсюджана ўпаўне законная форма часовага шлюбу, называемага «завадкыль-мушта». Гэтыя шлюбы заключаюцца на тэрмін ад аднаго месяца да некалькіх год. Дзяўчаты, як правіла, часовымі жонкамі не становяцца. У шыіцкіх цэнтрах нават склалася пэўная праслойка у асноўным з удоў і разведзеных жонак, якія згаджаюцца на часовыя шлюбы. Некаторыя асабліва прыгожыя жанчыны паспяваюць за сваё жыццё да дзесяці разоў заключыць шлюб. Дзеці ад такіх шлюбаў застаюцца ў... бацькі.

Па мусульманскаму праву ў гэтай краіне можна жаніцца завочна. Цяпер, праўда, гэта здараецца толькі ў самых глухіх мясцінах. Месца жаніха, які не можа прыбыць на сваё вяселле, займае пры афармленні шлюбу яго давераная асоба — «вікіль», які потым дастаўляе нявесту ў пакоі жаніха.

Дзяўчаты адной з індыйскіх кастаў маюць права выходзіць замуж толькі ў пэўны дзень, які бывае раз у 12 гадоў. Але яны знайшлі выхад абыходзіць гэты суровы закон, уступаючы ў шлюб з... букетам кветак. Як толькі кветкі завянуць, маладая жанчына лічыцца «ўдавой». А на ўдоў касты закон не распаўсюджваецца.

**У. ЯГОРЫЧАЎ.**

Аляксей Слабуха

## У гэты дзень...

Для тостаў шматлікіх
нямала прычын,
І ў кожным бывае сэнс
адмысловы.
І свой прысвячаю для нашых
жанчын
У гэты дзень сакавіцкі,
вясновы:
— Хай сонца заўжды вам
свеціць і грэе,
Смутку ніколі не ведаюць
вочы.
Хай споўняцца вашы мары,
надзеі,
Здароўе і шчасце з вамі
хай крочаць!

Ігорь Завьялов

## На перроне

Вьётся локон, упавший
с ладони,
Зачеркнула улыбку слеза,
И целую я в лёгком поклоне
Твои руки, лицо и глаза.

Не спеши снова трогать
прическу,
Дай мне выбрать глазами
твой взгляд.
Руки нежные, тонкого воска
Пусть, волнуясь,
мои теребят.

Ты до боли себе искусала
В ожиданьи подкрашенный
рот,
И глядишь широко и устало,
Словно глуби разлившихся
вод.

Знаю, вижу — разлука
жестока, —
Столько новых морщин
и седин!
Здравствуй, мама,
ты всё одинока?
Я вот тоже один и один.

* * *

Юры Карэйва

## Світальнае

Полымем бунтоўна
Ўспыхнуў ранак—
Зорак лёд
Растаў на шкле акна...
Што ж ты, сэрца, б´ешся,
Як падранак?
Нібыта ўвайшла ў пакой—
Яна...
Нібыта ўвайшла...
Сама — світанне,
Промні ўсмешак залатых—
Пад столь!..
Ды замест вітання—
Развітанне,
Не паспеў і вымавіць —
пастой!..

* * *

Можа, гэта
Толькі так здаецца,
Можа, гэта — сон,
Ці проста — зман вачэй?..
Што ж тады так б´ецца
табе,
Сэрца...
Б´ецца ўсё трывожней
і званчэй!..



Развітальны подых зімы
**Фотаэцюд У. САРОКІНА.**

## Не толькі ў пірагі

Як правіла, пітная сода кладзецца ў кулінарныя вырабы, выкарыстоўваецца ў некаторых іншых стравах. Але кожная гаспадыня павінна ведаць, што гэта ў многім першы яе памочнік.

Каб малако не першай свежасці пры кіпячэнні не згарнулася, дабаўце ў яго крыху соды (чвэрць чайнай лыжкі на літр малака).

Палоскі паперы з вокнаў лёгка знімаюцца, калі папярэдне змачыць іх растворам соды (чайная лыжка на літр цёплай вады).

Каструля, у якой нешта прыгарэла, ачысціцца, калі пракіпяціць у ёй ваду з адной-дзвюма сталовымі лыжкамі соды.

Носік чайніка для заваркі добра ачышчаецца, калі наліць у яго на дзве-тры гадзіны гарачы содавы раствор (чайная лыжка на шклянку вады), затым тройчы спаласнуць гарачай вадой.

Падпаліны ад праса на шоўку выводзяцца кашкай з соды. Яе наносяць на пляму, даюць высахнуць і чысцяць шчоткай.

Сверб ад укусаў пройдзе, калі пацерці гэта месца растворам соды (палавіну чайнай лыжкі на шклянку вады).

Мазалі на руках лечацца содавымі ванначкамі (сталовая лыжка на літр вады), калі рабіць іх некалькі разоў на тыдзень.

Рабаціннe і пігментныя плямы паблякнуць пасля рэгулярнай апрацоўкі твару растворам соды з шасці-сямі чайных лыжак на шклянку вады.

*Парады ўрачоў*

# НЕБЯСПЕЧНАЯ ХВАРОБА

У апошні час тэлебачанне, радыё і друк інфармуюць аб выпадках захворвання дыфтэрыяй сярод насельніцтва нашай рэспублікі. Што гэта за хвароба і як можна ад яе засцерагчыся?

Дыфтэрыя — вострае інфекцыйнае захворванне, якое выклікаецца дыфтэрыйнай палачкай, перадаецца паветрана-капельным шляхам ад хворых і бактэрыяносьбітаў. Узбуджальнікі дыфтэрыі захоўваюць жыццяздольнасць на акаляючых чалавека рэчах і ў пыле да двух месяцаў. Распаўсюджванню захворвання садзейнічаюць цесната ў памяшканнях, наяўнасць рэспіраторных вірусных інфекцый і нізкая санітарна-гігіенічная культура.

Інкубацыйны перыяд цягнецца ад 2 да 10 дзён. Пачатак хваробы нагадвае ангіну: з´яўляецца боль у горле пры глытанні, галаўны боль, павышаецца тэмпература цела. Нёбныя міндаліны запаляюцца, на іх утвараюцца налёты, ператвараюцца затым у шэрыя плёнкі. Плёнкавыя налёты могуць пераходзіць на нёбныя дужкі, язычок, заднюю сценку глоткі.

Пры клінічнай форме дыфтэрыі тэмпература цела павышаецца да 39—41° і трымаецца на гэтым узроўні на працягу 3—5 дзён. Хворыя адчуваюць моцны боль у горле, пагаршэнне глытання, нават вадкай ежы. З´яўляецца ацёк міндалін і мяккага нёба. На паверхні запаляльных тканак утвараюцца шэра-бруднага колеру налёты. Паветра, якое выдыхаецца з роту, набывае непрыемны пах. Нарастаюць з´явы агульнай інтаксікацыі арганізму, узмацняецца галаўны боль, на 2—3 суткі хваробы з´яўляюцца ацёк падскурнай клятчаткі шыі, дабаўляецца кашаль і асіпласць голасу, робіцца цяжкім дыханне, што можа прывесці да раптоўнай смерці ад задушша.

Захворванне дыфтэрыяй, як правіла, узрастае ў зімовы перыяд. Максімум захворванняў падае на старэйшы дашкольны і малодшы школьны ўзрост. У апошні час пачасціліся выпадкі з´яўлення цяжкіх форм сярод дарослых.

У мінулым годзе зарэгістраваны 2 выпадкі захворвання ў Лідскім і Смаргонскім раёнах. Рост захворвання выкліканы тым, што большасць насельніцтва не мае імунітэту супраць дыфтэрыі і таму часцей захворваюць пры кантакце з хворымі ці бактэрыяносьбітамі.

Пры першых прыкметах дыфтэрыі хворага трэба адразу пакласці ў пасцель і ізаляваць ад акружаючых, выклікаць урача. Самалячэнне стварае пагрозу для жыцця хворага. Нешта падобнае адбылося ў Гомельскай вобласці ў кастрычніку, калі хворы на працягу 2-х тыдняў лячыўся самастойна, што і прывяло да трагедыі.

Самым надзейным сродкам аховы ад дыфтэрыі з´яўляюцца прафілактычныя прышчэпкі. Эфектыўнасць вакцынацыі залежыць ад захоўвання яе тэрмінаў. Дарослых прышчэпліваюць кожныя 10 гадоў да 56-гадовага ўзросту. Калі здаровы дарослы чалавек знаходзіцца ў цесным кантакце з хворымі, то ён патрабуе імунізацыі без абмежавання ўзросту.

Каб папярэдзіць далейшае распаўсюджванне захворванняў дыфтэрыяй сярод насельніцтва, Галоўны дзяржаўны санітарны ўрач рэспублікі выдаў пастанову аб узмацненні прафілактычных і супрацьэпідэмічных мерапрыемстваў. Згодна з ёю была зроблена вакцынацыя супраць дыфтэрыі насельніцтва, якое мае пастаянныя кантакты, настаўнікаў і абслугоўваемы персанал школ, ВНУ, асоб, што жывуць у інтэрнатах.

Такое мерапрыемства праводзілася і ў нашым універсітэце. Але, на жаль, не ўсе прайшлі вакцынацыю. Таму звяртаемся да ўсіх супрацоўнікаў і студэнтаў з просьбай не адказвацца ад прафілактычных прышчэпак супраць дыфтэрыі.

**В. ПРАКАПОВІЧ,**
**Н. ЦАР,**
**дацэнты кафедры асноў медыцынскіх ведаў і аховы здароўя дзяцей.**

Наш адрас:
230023, г. Гродна,
вул. Ажэшкі, 22, пакой 404,
тэл. 44-72-97

Газета выходзіць два разы на месяц
Аб´ём газеты — адзін друкаваны аркуш

Наклад 2 000 асобнікаў

Газета надрукавана афсетным способам у Гродзенскай абласной узбуйненай друкарні г. Гродна, вул. Паліграфістаў, 4
Падпісана ў друк у 15.00.

Зак. 1172

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
ВУЧОНАЯ РАДА УНІВЕРСІТЭТА,
ПРАФКАМ СУПРАЦОЎНІКАЎ,
ПРАФКАМ СТУДЭНТАЎ

В. а. рэдактара
У. П. АМЕЛЬКА